воззвания, начинала отходить от пророссийской ориентации и переходить на сторону Германии и Австро-Венгрии. А на заключительном этапе войны стала ориентироваться на страны Антанты и США. Становилось все более очевидным, что польский вопрос из чисто внутреннего вопроса Российской империи начинал приобретать статус международного, чего всячески пытались избежать дипломаты России [2]. Февральская и Октябрьская революции 1917 г. поспособствовали актуализации польского вопроса в международном масштабе.

**Литература**

1. Белые пятна – черные пятна: сложные вопросы в российско-польских отношениях / [В. Г. Барановский и др.] ; под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда ; Российско-польская группа по сложным вопросам. – Москва : Аспект Пресс, 2010. – 823 с.

2. Иванов, Ю. В. Очерки истории российско (советско)-польских отношений в документах, 1914–1945 / Ю. В. Иванов. — Москва : Международные отношения, 2014. — 382 с.

3. Тымовский, М. История Польши / М. Тымовский, Я. Кеневич, Е. Хольцер ; пер. с польск. – М. : Весь мир, 2004. – 544 с.

## Амазонія – агульначалавечая спадчына?

*Дзянісава М. А., студ. ІІІ к. БДУ,*
*навук. кір. Фральцоў У. В., д-р гіст. навук, дац.*

Апошнім часам усё грамчэй заяўляюць пра сябе экаактывісты, «зялёныя» партыі набіраюць папулярнасць, становіцца модным весці «экалагічны» лад жыцця. Гэта не дзіўна, бо дзякуючы сацыяльным сеткам і інтэрнэту людзі па ўсім свеце імгненна даведваюцца пра экалагічныя катастрофы, якія адбываюцца за тысячы кіламетраў ад іх. У 2019 г. самым вядомым выпадкам з іх стаў лясны пажар у Паўднёвай Амерыцы, басейн ракі Амазонкі.

У навуцы аб міжнародных адносінах і сусветнай палітыцы існуе праблема непрызнання істотнасці экалагічных праблем і іх уплыву на светапарадак. Калі мы чуем спалучэнне слоў «глабальная пагроза», то звычайна ўяўляем сабе зброю масавай паразы ці тэрарыстычныя атакі, але ніяк не глабальнае пацяпленне і забруджванне Сусветнага акіяну. Так званая «зялёная» тэорыя не надта папулярная сярод палітолагаў, і яшчэ меней яе любяць палітыкі (магчыма, праблема ў «экацэнтрызме»). Але ці магчыма зусім ігнараваць пытанні экалогіі ў міжнародных адносінах?

Лясныя пажары не з’яўляюцца рэдкасцю для Амазоніі, асабліва падчас засушлівых сезонаў (з ліпеня па кастрычнік). Яны могуць быць выклікаканы

прыроднымі з’явамі (навальніцы і г.д.), але ў гэтым годзе асноўная частка пажараў стала вынікам сельскагаспадарчай дзейнасці – расчысткі зямлі пад пасевы ці выпас жывёлы. Павелічэнне маштабаў, інтэнсіўнасці і працягласці пажараў у асноўным уздоўж галоўных дарог у цэнтральнай бразільскай Амазоніі заўважыў Дуглас Мортан, кіраўнік лабараторыі біясферных навук Цэнтра касмічных палётаў імя Годарда (НАСА). У гэтым годзе павелічэнне колькасці пажараў у Амазоніі звязана з наўмыснай высечкай лесу, а не з вынікам надзвычай засушлівага сезона, як паведамляе Амазонскі інстытут даследаванняў навакольнага асяроддзя (Ipam). Вядома, што пажары часта выкарыстоўваюцца як спосаб ачысткі зямель для ферм пасля высечкі лясоў.

Чаму пажары ў Амазонцы выклікалі такі рэзананс у сусветнай супольнасці? Справа ў тым, што Амазонка – найвялікшы трапічны лес у свеце, а разам з гэтым – велізарнае сховішча ўглероду. Гэты лес адыгрывае важную ролю ў рэгуляванні глабальнага клімату: паглынае вуглякіслую газу і вытварае кісларод, тобок, амаль літаральна з’яўляецца лёгкімі планеты. Да таго ж Амазонія – адно з найбольш біяразнастайных месцаў на планеце: тут пражывае каля трох мільёнаў відаў жывёл і раслін.

Канцлер Германіі Ангела Меркель, прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон і прэм’ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан назвалі пажары міжнародным крызісам. Напрыканцы жніўня гэтага года лідары Групы G7 пагадзіліся вылучыць 20 мільёнаў еўра на стрымліванне пажараў. Тады Эмануэль Макрон заявіў, што сродкі будуць прадастаўлены неадкладна. Пры гэтым Д. Туск заявіў аб магчымым выхадзе ЕС з пагаднення аб свабодным гандлі з Бразіліяй, а таксама выказаў няўпэўненасць у тым, што ЕС здолее ратыфікаваць пагадненне з МЕРКАСУР пакуль Бразілія не кантралюе пажары. Францыя і Ірландыя таксама заявілі, што не будуць ратыфікаваць вялікую гандлёвую ўгоду з краінамі Паўднёвай Амерыкі, а міністр фінансаў Фінляндыі заклікаў ЕС разгледзець пытанне аб забароне ўвозу бразільскай ялавічыны.

Рэакцыя ўрада прэзідэнта Балсанару на заяўленні еўрапейскіх лідараў выклікала абурэнне з боку грамадзян Бразіліі і скалыхнула сацыяльныя сеткі далёка за межамі краіны. Жаір Балсанару і так крытыкаваўся за палітыку адносна рэгіёна Амазонкі: неасцярожная падтрымка сельскагаспадарчага бізнесу адлюстравалася ў рэзкім паніжэнні колькасці штрафаў за экалагічныя парушэнні ў рэгіёне згодна з дадзенымі Бразільскага інстытута навакольнага асяроддзя і аднаўляльных прыродных рэсурсаў (Ibama), што потым вылілася ў больш відавочныя наступствы – высечку лесу і лясныя пажары. Урад прэзідэнта Балсанару бачыць у рэакцыі еўапейскіх дзяржаў неакаланіялізм і непавагу да бразільскага суверэнітэту.

Прэзідэнт Францыі Макрон назваў Амазонію «нашым агульначалавечым дабром» і «домам». Гэты тэзіс не з’яўляецца новым, ён ужо выказваўся ра-

ней іншым прэзідэнтам Францыі Мітэранам, які называў Амазонію «агульначалавечай спадчынай». Да гэтай пазіцыі можна ставіцца па-рознаму, усё залежыць ад таго, з якога боку яе разглядаць. З пункта гледжаня «зялёнай тэорыі» насельніцтва планеты экалагічна ўзаемазвязана, што ўплывае на тое, як міжнародная супольнасць успрымае і разбіраецца з праблемамі навакольнага асяроддзя. Згодна з «зялёнай тэорыяй» рэакцыя еўрапейскіх лідараў і экаактывістаў па ўсім свеце з'яўляецца абсалютна заканамернай і лагічнай. З іншага боку, калі сыходзіць з канцэпцыі «вестфальскай дзяржавы», то стаўленне да Амазоніі, як да агульначалавечай спадчыны можна сапраўды разглядаць як парушэнне суверэнітэту і права на неўмяшанне ва ўнутраныя справы.

**Літаратура**

1. Eckersley, R. Green theory / R. Eckersley // International Relations Theories: Discipline and Diversity / R. Eckersley, T. Dunne, M. Kurki, S. Smith. – 3-d ed. – Oxford : Oxford Univ. Press, 2013. – P. 266–285.

2. BBC News Brasil [Electronic resource]. – ‚O que eles querem lá?‘, diz Bolsonaro sobre oferta de ajuda do G7 para Amazônia. – Mode of access: https://www.bbc.com/portuguese/brasil-49471483. – Date of access: 05.11.2019.

3. BBC News Brasil [Electronic resource]. – De Fordlândia a ‚bem comum‘: as contradições na história do interesse estrangeiro na Amazônia. – Mode of access: https://www.bbc.com/portuguese/brasil-49363394. – Date of access: 01.11.2019.

# Der Berliner Mauer – der lange Weg zur Einheit

*Ермак К. А., студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. преп. Бабына Е. И.*

Die Berliner Mauer… Was für eine große Bedeutung hat dieses Denkmal der Geschichte für das deutsche Volk! 28 Jahre, 2 Monate und 27 Tage lang teilte die vier Meter hohe Mauer die Stadt in zwei Hälften. Die Berliner Mauer wurde zum Symbol der deutschen Teilung und des Kalten Krieges.

„Niemand hat die Absicht, Mauer zu errichten!“ Diesen Satz sagte im Juni 1961 zu einer westdeutschen Journalistin DDR-Staatchef Walter Ulbricht. Nicht einmal zwei Monate später schlossen Ostdeutsche Soldaten alle Verkehrswege zwischen dem westlichen und dem östlichen Teil Berlins. Schon ins Frühe des 13. August wurde den Bau der Berliner Mauer begonnen. Wie kam es überhaupt dazu? Die Zeit nach dem Zweiten Weltkrieg war eine sehr gute Zeit für Mauerbauer. Die ideologischen Mauern damals gingen durch Köpfe, Länder und Kontinente, und der Streit war sehr intensiv. Damit war der jahrzehntlange politische und ökonomische Konflikt zwischen den kommunistischen und den west-kapitalistischen